даследавання фальклору ў вышэйшых навучальных установах Беларусі. Пры БДУ працуюць 3 фалькл. калектывы: Мінскі фалькл. гурт нар. песні «Роднiца»(з 1979), Мінскі фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш» (з 1980), Мінскі народны фальклорны ансамбль «Тутэйшая шляхта» (з 1992).

*В.Дз. Ліцьвінка.*

**БЕЛАРУ́СКІ ДЗЯРЖА́ЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУ́РЫ І МАСТА́ЦТВАЎ.** Адкрыты 1.9.1975 як Мінскі інстытут культуры. З 30.9.1993 сучасная назва. Імкнецца мэтанакіравана здзяйсняць праграму фіксацыі, вывучэння, захавання і трансляцыі фальклору ў самым шырокім спектры яго праяў. Кафедра нар.-інструментальнай творчасці універсітэта (створана ў 1975; загадчык — прафесар Е.Яканюк) ажыццяўляе падрыхтоўку кіраўнікоў аркестраў нар. інструментаў, кіраўнікоў ансамбляў і выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін (баян, акардэон, цымбалы, домра і інш.). Папулярнасць заваявалі: ансамбль нар. інструментаў (мастацкі кіраўнік Л.Валасюк); ансамбль акардэаністаў «Туці» (Л.Сухаварава), ансамблі «Беларускія ўзоры» (Г.Мішуроў), «Баламуты» (В.Трамбіцкая), «Ліра» (Л.Жывалеўская), струнны квартэт (Н.Смольская-Зяневіч), ансамбль цымбалістаў (М.Міцуль), аркестр бел. нар. інструментаў (В.Валадковіч), інструментальная капэла (А.Скорабагатчанка). Сярод выпускнікоў кафедры — саліст Дзяржаўнага аркестра імя І.Жыновіча А.Крамко, удзельнікі фалькл. гурта «Крупіцкія музыкі» З.Філонава, С.Колас, Я.Круглік, музычны кіраўнік гурта «Валачобнікі» В.Рамановіч і інш. Кафедра харэаграфіі (заснавана ў 1977; загадчык — С.Гуткоўская) рыхтуе спецыялістаў у галіне харэаграфічнага мастацтва, у т. л. і па спецыялізацыі «народны танец». На кафедры працуе прафесар, доктар мастацтвазнаўства, аўтар шматлікіх навуковых прац па харэаграфічным фальклоры Ю.Чурко. Адметная рыса кафедры — актыўны ўдзел студэнтаў у міжнародных і нац. конкурсах і фестывалях па традыцыйным мастацтве танца. Кафедра духавой музыкі (створана ў 1979, заг. С.Жарко) рыхтуе студэнтаў па спецыяльнасцях «народная творчасць» (спецыялізацыя «інструментальная музыка духавая»), «інструментальнае выканальніцтва» (спецыялізацыя «народныя духавыя інструменты»). На кафедры 11 мастацкіх калектываў, у т. л. канцэртны духавы аркестр «Светач» (В.Парамонаў), ансамбль трамбаністаў «Акорд» (А.Перапялюк), ансамбль дудароў (У.Гром), ансамбль ударных інструментаў (Дз. Ваза). Выпускнікі кафедры майстар па вырабе музычных інструментаў У.Пузыня, гукарэжысёр музычных праграм Белтэлерадыёкампаніі В.Грыбенка, саліст Мінскага аркестра духавых інструментаў «Няміга» А.Вячынскі і інш. Кафедра бел. народна-песеннай творчасці (створана ў 1981; загадчык — прафесар С.Дробыш) вядзе падрыхтоўку па спецыялізацыях «харавая народная музыка», «фальклорнае мастацтва», «народныя спевы». На кафедры творчыя калектывы: фалькл. гурты «Валачобнікі» (С.Дробыш) і «Грамніцы» (У.Зяневіч), гурт нар. песні «Талака» (С.Шарамецьеў і І.Грамовіч), квартэт «Надзея» (Н.Баканова), нар. хор (С.Дробыш). Выпускнікі кафедры заслужаныя артысты Беларусі В.Пархоменка, Г.Радзько, Н.Кавалёва, артысты Дзяржаўнага акадэмічнага нар. хору Рэспублікі Беларусь імя Г.І.Цітовіча: Н.Раманская, Г.Зямцова, М.Рудзянец, Т.Фралова, салісты ансамбля «Песняры» В.Дайнека, В.Місевіч, А.Эскін, саліст ансамбля «Сябры» М.Сацура. Фалькл. калектывамі кіруюць выпускнікі кафедры В.Гладкая (гурт «Неруш»), А.Навіцкая (дзіцячы фалькл. гурт «Зорачка»), І.Кірчук (ансамбль «Троіца»). Кафедра рэжысуры абрадаў і свят (працуе з 1992; загадчык — прафесар П.Гуд) рыхтуе студэнтаў па спецыялізацыях «рэжысура народных абрадаў і свят», «рэжысура масавых відовішчаў і свят». Сурацоўнікі кафедры адрадзілі святы «Каляды», «Гуканне вясны», «Юр'е», «Вялікдзень», «Купалле», «Дажынкі», «Кірмаш». У традыцыю бел. святочнай культуры пераўтварыліся такія работы П.Гуда, як Міжнародны фестываль нар. музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (г. Паставы), Усебеларускі фестываль нац. культур (г. Гродна), Усебеларускі фестываль нар. гумару (в. Аўцюкі Калінкавіцкага раёна). Пры кафедры створаны духоўны тэатр «Анёл» (Н.Міцкевіч), тэатр бел. нар. гульні (А.Камінскі), фалькл.-інструментальны гурт «Аляхновічы» (А.Аляхновіч). Сярод выпускнікоў кафедры салістка і рэжысёр-пастаноўшчык студыі «Сябры» А.Ярмоленка, дырэктар Гомельскага абласнога тэатра лялек Дз.Гарэлік, рэ-

жысёр-пастаноўшчык міжнародных і рэспубліканскіх свят В.Бізюк. Навукова-даследчая работа вядзецца над калектыўнымі і індывідуальнымі тэмамі, дзяржаўнымі і галіновымі навукова-практычнымі праграмамі, падрыхтоўкай падручнікаў па спецыяльных дысцыплінах, удзелам у навуковых канферэнцыях і семінарах. Шэраг навукова-даследчых і навукова-творчых лабараторый вывучаюць традыцыйную музычна-інструментальную, танцавальную, песенную культуру Беларусі, спрыяюць яе адраджэнню ў розных формах выканальніцтва. Навукова-даследчая работа па традыцыйным фальклоры вядзецца ва ўзаемадзеянні з інш. навучальнымі і навуковымі ўстановамі рэспублікі, найперш з Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. Ажыццяўляецца навуковае супрацоўніцтва са шматлікімі замежнымі ўстановамі, бел. нац. дыяспарамі Расіі, Украіны, Польшчы, ЗША. Фалькл.-этнаграфічныя калектывы «Валачобнікі», «Грамніцы», «Баламуты», ансамблі «Натхненне», «Спадчына», «Туці» ўдзельнічалі ў міжнародных фестывалях у Расіі, Украіне, Польшчы, ФРГ, Венгрыі, Германіі, Балгарыі, Галандыі, Італіі, ЗША, Бельгіі і інш. Акадэмічны хор «Мара», мужчынскі хор «Віват», харэаграфічныя калектывы, аркестры і ансамблі нар. інструментаў, сімфанічны і духавы аркестр «Светач» аб'ядноўваюць практычна ўсіх студэнтаў факультэта музычнага мастацтва універсітэта. Выпускнікі запатрабаваны ўстановамі культуры, якія звязаны з захаваннем і распаўсюджаннем фальклору: тэатрамі і клубнымі ўстановамі, цэнтрамі нар. творчасці, прафесійнымі і аматарскімі харавымі, музычнымі, харэаграфічнымі калектывамі Беларусі.

*А. У. Марозаў.*

**«БЕЛАРУ́СКІ ЗБО́РНІК»**, фундаментальны збор бел. фальклору, абрадаў і звычаяў і інш. відаў аўтэнтычнай нар. творчасці. Сабраны Е.*Раманавым*. Складаецца з 14 выпускаў. Асноўная частка апублікавана пры жыцці аўтара (вып. 1—9, 1886—1912). Матэрыялы 10-га выпуска апублікаваны ў 1928 у «Запісках Аддзела гуманітарных навук» (кн. 2, т. 1), 11—14-ы выпускі, якія захоўваліся ў архівах, загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Збіральніцкую дзейнасць Е.Раманаў праводзіў у Магілёўскай (уключала частку сучаснай Гомельскай вобл.), Віцебскай, Мінскай губернях. Даследаваліся нац. самабытнасць бел. культуры і яе мова. 1-ы том зборніка (вып. 1—2, Кіеў, 1886) уключае песні, прыказкі, прымаўкі і загадкі, сабраныя ў Магілёўскай губерні. У прадмове адзначаны заслугі А.Бяссонава, А.Дамбавецкага, І.Насовіча, З.Радчанкі, П.Шэйна і інш. ў даследаванні нар. культуры, звернута ўвага на недахопы папярэдніх збораў (не заўсёды ідэнтычныя творы, моўныя скажэнні, адсутнасць тыпалогіі). У 2 выпускі ўвайшлі 910 песень і 300 прыпевак (сямейныя, любоўныя, дзіцячыя, гумарыстычныя, чумацкія, разбойніцкія, арыштанцкія, талочныя, купальскія, жніўныя, гульнявыя, духоўныя, царкоўныя, вяснянкі і інш.), 757 прыказак і прымавак, 451 загадка. У 3-і выпуск (Віцебск, 1887) уключаны 192 казкі, запісаныя ў Гомельскім, Аршанскім, Горацкім, Быхаўскім, Клімавіцкім, Чэрыкаўскім, Мсціслаўскім паветах Магілёўскай губерні Вылучаны казкі міфалагічныя (95), бытавыя, сатырычныя, гумарыстычныя (29), казачныя апавяданні (12), дакучныя байкі, гумарыстычныя дыялогі, фалькларызаваныя літаратурныя творы і інш. У прадмове і каментарыях да зборніка змешчаны адказы на крытычныя заўвагі рэцэнзентаў першых выпускаў (спалучэнне некалькіх вершаваных радкоў дзеля эканоміі сродкаў), апісана методыка збору нар. твораў, абазначаны асноўныя дыялекты нар. гаворак, прапанавана сістэма іх тыпалогіі паводле сюжэтаў і жанраў. Гэтую тэматыку пад назвай «Казкі касмаганічныя і культурныя» працягвае 4-ы выпуск (Віцебск, 1891). Яму нададзена сюжэтна-тэматычнае адзінства, улічаны крытычныя заўвагі рэцэнзентаў. У зборніку апублікаваны 170 аднатыпных казак, створаных шляхам мастацкага пераўтварэння касмалагічных, антрапалагічных, астральных, дуалістычных і інш. міфаў («Бог і Д'ябал», «З таго свету навіны», «Юрый, Мікола і мужык» і інш.). У «культурныя казкі» ўключаны паданні і легенды, заснаваныя на фальклярызацыі вобраза Бога, Хрыста, апосталаў і святых (перанясенне рэлігійных персанажаў з неба на зямлю і набліжэнне іх да людскога жыцця, напрыклад, «Сляды Багародзіцы», «Бог і ўдава» і інш.). Такой жа тэматычнай цэласнасцю характарызуецца 5-ы выпуск